*§ 35–0. Фашызм у Еўропе і свеце

ВЕЙМАРСКАЯ РЭСПУБЛІКА
ТРЭЦІ РЭЙХ
НАРОДНЫ ФРОНТ
НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІЗМ
ТАТАЛІТАРНЫ ПАЛІТЫЧНЫ РЭЖЫМ

Стварэнне таталітарнай дзяржавы

1. Фашызм як ідэалогія і форма дзяржаўнага праўлення. Фашызм імкнуўся да стварэння таталітарнай дзяржавы. Такая дзяржава ставіць за мэту ўсталяваць поўны кантроль над грамадствам і кожным асобным чалавекам.

РЫСЫ ФАШЫСЦКАЙ ІДЭАЛОГІІ

КРАЙНІ НАЦЫЯНАЛІЗМ

Фашысты абвяшчалі сябе **сапраўднымі носьбітамі інтарэсаў нацыі** як адзінага цэлага, найважнейшую задачу бачылі ў дасягненні адзінства нацыі. У гэтай адзінай нацыі мелі знікнуць індывідуальныя інтарэсы прыватнай асобы, сацыяльных груп

Абсалютная вартасць дзяржавы як захавальніка «народнага духу», абаронцы нацыянальных інтарэсаў

Абсалютызацыя нейкай **адной ідэі**:
- у італьянскіх фашыстаў — велічы нацыі;
- у нацыстаў — расавай перавагі арыйцаў-немцаў

«РАСАВАЯ ТЭОРЫЯ»

У яе аснове міф пра **абранасць «вышэйшай арыйскай расы»**. Нацызм звужаў паняцце «народ» да арыйскай расы. Нацысты бачылі сваю задачу ў разгортванні ўсеагульнай барацьбы за ўсталяванне расавага сусветнага парадку. Падчас гэтай барацьбы яны апраўдвалі ўсе злачынствы супраць прадстаўнікоў «ніжэйшых рас»

Агрэсіўнасць, нецярпімасць да ўсялякага іншадумства. Распрацоўшчыкі фашысцкай ідэалогіі крытыкавалі канцэпцыю класавай барацьбы камуністаў і сацыялістаў, бо яна разбурала адзінства нацыі. Падвяргаліся крытыцы і ліберальныя погляды, паводле якіх чалавечая асоба разглядалася як носьбіт універсальных правоў і свабод, незалежных ад яе прыналежнасці да пэўнай нацыі

Зварот не да розуму, а да пачуццяў, падсвядомасці людзей. Імкненне даць найпрасцейшыя адказы на найважнейшыя праблемы свайго часу

Сэрцавінай фашысцкага руху і рэжыму выступае масавая палітычная партыя. Фашысцкія і нацыянал-сацыялістычныя партыі намагаліся ўсталяваць сваю нічым не абмежаваную дыктатуру. Іх улада абапіралася галоўным чынам на гвалт і згоду асноўнай масы насельніцтва мірыцца з фашысцкім рэжымам. Гэтая згода насаджалася праз навязванне грамадству адзінай афіцыйнай ідэалогіі і дзейнасць падкантрольных фашысцкай партыі грамадскіх арганізацый. Яны імкнуліся ахапіць кожнага чалавека і стварыць масавую базу для дыктатуры.

Наяўнасць масавай падтрымкі вылучае фашысцкія рэжымы сярод іншых тыпаў дыктатур. Апарат фашысцкай партыі зрошчваецца з дзяржаўнай бюракратыяй. У аснове кіравання таталітарнай дзяржавай і фашысцкай партыяй ляжыць прынцып фюрарства (правадырства). На чале іх стаіць правадыр, які мае неабмежаваную ўладу і абсалютны аўтарытэт. У таталітарнай дзяржаве цалкам падаўленыя правы і свабоды асобы.

У эканамічнай галіне фашысты і нацысты захавалі прыватную ўласнасць, але істотна абмежавалі рыначныя адносіны і перайшлі да актыўнага дзяржаўнага рэгулявання. Яго галоўнай мэтай было нарошчванне ваеннай вытворчасці.

Развіццё фашысцкага руху

Першая сусветная вайна пахіснула веру людзей у дэмакратычныя каштоўнасці. Яна нарадзіла ў грамадстве песімістычныя настроі, культ гвалту. Дзяржава, якая спярша зрынула людзей у жахі вайны, а пасля аказалася не ў стане перасіліць яе цяжкія наступствы, расчаравала еўрапейцаў. Фашысцкія партыі, што паўсталі пасля Першай сусветнай вайны, бачылі выхад з крызісу, у якім апынуліся заходнія краіны, ва ўсталяванні дыктатуры на чале з моцным лідарам.

У кароткі перыяд эканамічнага росту 1920-х гг. уплыў фашыстаў у розных краінах знізіўся. Эканамічны крызіс 1929–1933 гг. выклікаў новую хвалю расчаравання людзей у парламенцкай дэмакратыі і рынкавай эканоміцы. Яны аказаліся не здольныя прадухіліць катастрафічныя наступствы крызісу: масавае беспрацоўе, галечу. Шырокія масы бачылі ў ліберальнай дзяржаве галоўнага вінаўніка эканамічнай катастрофы і гатовыя былі падтрымаць яе ліквідацыю і ўсталяванне ўлады моцнай асобы, якая забяспечыць выхад з крызісу. Названыя фактары паспрыялі новаму ўздыму фашысцкага руху ад пачатку 1930-х гг.

Успомніце прычыны, шляхі выхаду і наступствы эканамічнага крызісу 1929–1933 гг.

2. Усталяванне фашысцкага рэжыму ў Італіі і нацысцкага рэжыму ў Германіі. Шырокія колы насельніцтва Італіі былі незадаволеныя вынікамі Першай сусветнай вайны. Гэта нараджала магутную хвалю нацыяналістычных настрояў, чым і карысталася Нацыянальная фашысцкая партыя Б. Мусаліні для ўзмацнення свайго ўплыву ў краіне. Фашыстам было выгадна тое, што традыцыйныя парламенцкія партыі дэманстравалі няздольнасць перамагчы пасляваенныя эканамічныя і сацыяльныя праблемы. У краіне адбываліся масавыя забастоўкі, рабочыя пачалі захопліваць прадпрыемствы. Прадпрымальнікі, напалоханыя «чырвонай пагрозай», у фашыстах бачылі сілу, здольную стабілізаваць сітуацыю ў краіне. Ва ўмовах крызісу фашысты здолелі прыцягнуць на свой бок розныя пласты насельніцтва. З аднаго боку, яны абяцалі абараніць правы ўласнасці, з другога — выстаўлялі лозунгі сацыяльнай справядлівасці. У кастрычніку 1922 г. фашысты арганізавалі «паход на Рым» штурмавых атрадаў. Кароль Віктар Эмануіл III саступіў ціску і прызначыў Б. Мусаліні прэм'ер-міністрам Італіі.

Італія

Віктар Эмануіл III, кароль Італіі (1900–1946)

Германія

У Германіі ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу хутка рос уплыў Нацыянал-сацыялістычнай нямецкай рабочай партыі (НСДАП) на чале з А. Гітлерам. У сваіх праграмных лозунгах яна імкнулася задаволіць інтарэсы самых розных колаў грамадства. Нацысты заяўлялі, што адразу дасягнуць выхаду з крызісу і ліквідуюць беспрацоўе. Патрабавалі экспрапрыяцыі непрацоўных даходаў, пераходу ва ўласнасць дзяржавы буйны́х манаполій. Дробным гандлярам абяцалі перадаць у іх рукі буйны́я ўніверсальныя магазіны, абвяшчалася падтрымка сялянскіх гаспадарак. Многія абяцанні нацыстаў супярэчылі адно аднаму і былі невыканальныя. Але падчас крызісу людзі верылі ў іх рэальнасць. НСДАП спрытна выкарыстоўвала ў сваіх інтарэсах нацыяналістычныя і патрыятычныя лозунгі ў сувязі з незадаволенасцю немцаў Версальскай дамовай.

Паўль фон Гіндэнбург, прэзідэнт Германіі (1925–1934). Мастак М. Ліберман

Поспеху нацыстаў спрыяў раскол антыфашысцкіх сіл. Сацыял-дэмакраты і камуністы варагавалі паміж сабой і не змаглі аб'яднацца, каб супрацьстаяць нацызму. Многія прадстаўнікі германскай эліты, якія не падзялялі погляды нацыстаў, лічылі іх «меншым злом» у параўнанні з камуністамі. Таму сярод буйны́х прамыслоўцаў была значная колькасць тых, хто падтрымліваў НСДАП. Парламенцкія выбары, якія прайшлі ў 1932 г., паказалі, што па колькасці атрыманых галасоў яна ператварылася ў найбольш уплывовую партыю Германіі. У такой сітуацыі 30 студзеня 1933 г. прэзідэнт П. фон Гіндэнбург прызначыў А. Гітлера канцлерам і даручыў яму фарміраванне ўрада.

Дзяржавы з дэмакратычнымі рэжымамі

3. Пашырэнне фашызму ў Еўропе. Ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызісу нават у дзяржавах са сталымі дэмакратычнымі традыцыямі — ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Канадзе, Скандынаўскіх краінах — сфарміраваліся фашысцкія або крайне нацыяналістычныя партыі. Аднак названыя краіны здолелі захаваць дэмакратычныя рэжымы. Гэтаму спрыяла

правядзенне ў іх шырокіх рэформаў у інтарэсах простых людзей. Фашысцкі рух тут не стаў масавым, як правіла, быў расколаты на некалькі арганізацый.

Іспанія і Партугалія

Фашысцкія рэжымы, якія мелі свае адметнасці, усталяваліся ў Іспаніі і Партугаліі. У Іспаніі фашысцкі рэжым зацвердзіўся ў выніку перамогі генерала Ф. Франка ў Грамадзянскай вайне 1936–1939 гг. У Партугаліі фарміраванне рэжыму фашысцкага тыпу звязанае з усталяваннем у 1932 г. аднаасобнай улады А. Салазара. Адметнасць фашысцкіх рэжымаў у Іспаніі і Партугаліі ў тым, што разам з фашысцкімі арганізацыямі вялікую ролю ў палітычным жыцці працягвалі адыгрываць традыцыйныя рэакцыйныя сілы: буйны́я землеўладальнікі, духавенства, ваеншчына.

У Аўстрыі вялі паміж сабой барацьбу за ўладу аўстрафашысты і нацысты. Першыя з іх у 1934 г. усталявалі сваю дыктатуру, якая праіснавала да аншлюсу Аўстрыі Германіяй.

Успомніце дату аншлюсу Аўстрыі.

У Венгрыі ва ўмовах дыктатуры Хорці, у Румыніі пасля здзейсненага манархам у 1938 г. антыканстытуцыйнага перавароту ўсталяваліся аўтарытарныя рэжымы, якія актыўна супрацоўнічалі з фашысцкімі партыямі.

Адметнасці фашысцкага руху ў Японіі

4. Мілітарызм у Японіі. Сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. паспрыяў уздыму фашызму ў Японіі. Адметнасцю фашысцкага руху ў гэтай краіне было тое, што галоўную ролю ў ім адыгрывалі вайскоўцы, а масавая фашысцкая партыя не была створана. У аснове праграмы японскага фашызму была ідэя ніпанізму (японізму). Згодна з ёю меркавалася стварыць таталітарную дзяржаву, усе грамадзяне якой будуць уяўляць сабой адзіную сям'ю на чале з бацькам-імператарам. Гэтая адзіная нацыя разгорне барацьбу за панаванне ў Азіі. Кіроўная эліта Японіі і сам імператар не падтрымалі фашысцкія

Хірахіта, імператар Японіі (1926–1989)

арганізацыі. Здзейсненая імі ў 1936 г. спроба ваеннага перавароту пацярпела паражэнне.

Разграміўшы фашысцкія арганізацыі, бюракратыя, што гуртавалася вакол імператара, уладары буйны́х канцэрнаў, большасць афіцэраў пачалі ажыццяўляць на практыцы многія палажэнні іх праграмы. Пачалося будаўніцтва таталітарнай дзяржавы. Спынілі дзейнасць усе палітычныя партыі. У 1940 г. быў абвешчаны курс на стварэнне ў Японіі «новай палітычнай структуры». Яе цэнтральным элементам зрабілася арганізацыя Асацыяцыя дапамогі трону (АДТ), кіраўнік якой аўтаматычна рабіўся прэм'ер-міністрам. Мясцовыя аддзяленні АДТ узялі пад свой кантроль органы ўлады ў прэфектурах, гарадах, пасёлках. Быў створаны шэраг масавых арганізацый, падпарадкаваных АДТ. Гэта дазволіла ўладзе ўсталяваць поўны кантроль над грамадствам. Мэта стварэння «новай палітычнай структуры» палягала ў тым, каб аб'яднаць нацыю вакол імператара і накіраваць яе на барацьбу за ўсталяванне панавання Японіі ў Азіі.

Найважнейшай рысай «новай палітычнай структуры» быў мілітарызм. Ваенныя аказвалі велізарны ўплыў на палітыку дзяржавы. З дапамогай дзяржаўнага рэгулявання эканоміка імкліва перабудоўвалася на выраб ваеннай прадукцыі. Крайняй агрэсіўнасцю пачынаючы з 1930-х гг. вылучалася знешняя палітыка Японіі. Яе лагічным завяршэннем было аб'яднанне Японіі з фашысцкімі дзяржавамі ў ваенна-палітычны саюз, яе актыўная роля ў распачынанні Другой сусветнай вайны.

Фашысцкая ідэалогія пачала пашырацца ў Еўропе і свеце ва ўмовах расчаравання грамадства ў парламенцкай дэмакратыі і рыначнай эканоміцы. Частка кіроўнай эліты заходніх дзяржаў падтрымала фашызм, бо бачыла ў ім эфектыўную сілу ў барацьбе з камуністамі.

калі ў свеце...

1922 г. — прыход фашыстаў да ўлады ў Італіі

на тэрыторыі Беларусі...

1920-я гг. — правядзенне палітыкі нацыянальна-культурнага і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва (беларусізацыі)

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Дайце характарыстыку фашызму як ідэалогіі і формы дзяржаўнага кіравання.
2. Растлумачце прычыны ўсталявання фашысцкіх рэжымаў у Італіі і Германіі ў 1920–1930-я гг.
3. Складзіце ментальную карту (схему) «Пашырэнне фашызму ў Еўропе». Зрабіце вывад наконт прычын адметнасцей пашырэння фашысцкай ідэалогіі ў розных краінах Еўропы.
4. Назавіце асноўныя адметнасці фашысцкага руху ў Японіі. Ці звязаныя яны з асаблівасцямі гістарычнага і культурнага развіцця краіны?